Т. І. ЛАПУШКА
Пінск, ДУА «СШ № 18 г. Пінска»

ИГРОВАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ДЕТЕЙ: ИГРОВЫЕ ТЕХНОЛОГИИ ОБУЧЕНИЯ («ВЫКАРЫСТАННЕ МНЕМАТЭХНІЧНЫХ ПРЫЁМАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»)

Адна з мэт сучаснай агульнай сярэдняй адукацыі – падрыхтоўка высокаадукаванай, высокакультурнай асобы. Яна павінна ажыццяўляцца сродкамі беларускай мовы [5].

Мова з'яўляецца найважнейшым сродкам фарміравання культуры асобы, яе светапогляду і інтэлекту. Дзякуючы мове, пры належным валоданні ёю як інфарматыўным, інтэрактыўным і перцэптыўным сродкам адбываецца працэс духоўнага станаўлення чалавека, захаванне і перадача ім сацыяльна-культурнага вопыту, што забяспечвае ўключэнне яго ў рэальнае жыццё і працу ў грамадстве [3].

Сёння актуальнай з'яўляецца праблема пераапрацоўкі вучнямі інфармацыі, фрагментарнасці ўспрымання вучэбнага матэрыялу, прадуктыўнасці запамінання матэрыялу, актывізацыі пазнавальнай дзейнасці. Патрэбна дапамагаць вучням назапашваць навыкі, неабходныя для самаадукацыі, самапазнання і выхавання, вучыць карыстацца імі ў штодзённым жыцці. А гэта азначае, што беларуская мова з'яўляецца не толькі прадметам вывучэння, але і сродкам пазнання, развіцця і выхавання. [1].

Як дабіцца выніковасці, як зрабіць запамінанне лягчэйшым, прывіць імкненне да пазнавальнай дзейнасці? Якія тэхналогіі, метады і прыёмы пры гэтым выкарыстоўваць?

Азнаёміўшыся з тэарэтычнымі аспектамі прымянення розных тэхналогій навучання, я зрабіла выснову, што развіццё пазнавальнай актыўнасці вучняў магчыма праз выкарыстанне мнематэхнічных прыёмаў.

Мнемонікай (мнематэхнікай) называюць «сістэму разнастайных прыёмаў, якія робяць лягчэйшым запамінанне і павялічваюць аб'ём прыгаданага матэрыялу шляхам утварэння штучных асацыяцый» [8, с. 321].

Неабходна адзначыць, што на важную ролю асацыяцый у працэсах памяці звяртаў увагу Арыстоцель. У XVIII – XIX стагоддзях вучэнне аб асацыяцыі было ў аснове асацыятыўнай псіхалогіі, якая распаўсюдзіла прынцып асацыяцыі .

Вывучэннем гэтага пытання займаліся вучоныя-псіхолагі Л. С. Выгоцкі, А. М. Лявонцьеў, П. І. Зінчанка, якія сцвярджалі, што неабходна перагледзець пытанне аб ролі мнематэхнікі, што неабходна знайсці прымяненне гэтаму вялікаму педагагічнаму сродку. В. В. Агафонаў вельмі

ўдала апісаў механізм работы прыёмаў мнематэхнікі: «Калі сувязь паміж словамі нечаканая, абсурдная, то вышэй эфектыўнасць запамінання».

«Мнемоніка – сукупнасць прыёмаў, якая мае на мэце забяспечыць запамінанне магчыма большай колькасці звестак, фактаў» [7, с. 160]. Мнеманічныя прыёмы дазваляюць мабілізаваць увагу вучняў і памяць, а паспяховае запамінанне аблягчае працэс засваення.

Мнематэхнічныя прыёмы можна выкарыстоўваць у любым узросце вучняў, але пажадана, калі ўзнікаюць цяжкасці ў засваенні вучэбнага матэрыялу з-за ўзроставых асаблівасцей (імпульсіўнасць, няўстойлівасць увагі), адаптацыі пры пераходзе з пачатковай школы ў сярэдняе звяно. Вельмі важна, каб знаёмства з новым матэрыялам не прынесла расчаравання, а, наадварот, садзейнічала ўзнікненню цікавасці ў засваенні, зрабіла працэс навучання займальным. Вось тут на дапамогу прыходзяць мнематэхнічныя прыёмы.

Мнематэхнічныяпрыёмы класіфікуюцца на наступныя групы:

1) Гука-літарная мнемоніка (наяўнасць аднолькавых літар і гукаў, магчыма частковае падабенства). Прыкладам першай групы – наяўнасць аднолькавых літар і гукаў – можа быць такі мнемапрыём:Г**е**рой – Г**е**на – г**е**рой;**ланд**ыш – **ланд**шафт у**ланд**ышах; **вера**нда – **Вера** і Ва**нда.**

2) Рыфмоўкі. Агульнасць націску. Мнемарыфмоўкі спрашчаюць засваенне матэрыялу.

Ма*лы* любіць есці *лы*жкай.

Прыйшоў пасла*н*ец, прынёс ледзян*е*ц.

3) Казка – асацыяцыя. У такіх казках граматычны тэрмін, паняцце запамінаецца лепш, бо «праходзіць» не толькі праз лагічнае мысленне, але і праз фантазію.

4) Асацыяцыі (вобразныя, графемныя). Пры такім прыёме запамінанне і ўзнаўленне значэння слова адбываецца праз малюнак прадмета.

5) «Матэрыяльная» («пальцавая») мнематэхніка. Калі правіла мы можам «патрымаць» у руках, то справа ідзе пра «матэрыяльную» мнематэхніку.

Выкарыстанне на ўроках эфектыўных мнематэхнічных прыёмаў садзейнічае развіццю пазнавальнай актыўнасці вучняў, засваенню моўнай тэорыі.Такія прыёмы дапамагаюць запомніць правапіс слоў, правілы, бо выклікаюць зрокавыя і сэнсавыя асацыяцыі, якія садзейнічаюць хуткаму запамінанню.

Спіс выкарыстаннай літаратуры

1. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. Беларуская літаратура. V – IX класы. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017

2. Выкладанне беларускай мовы ў школе /М. Г. Яленскі, Л. С. Васюковіч, І. М. Саматыя і інш. – Мінск : Нар. асвета, 1994. – 239 с.

3. Канцэпцыя вучэбнага прадмета “Беларуская мова” //Роднае слова. – 2009. – № 8

4. Лисовская, Е. А. Узелки на память, или Мнемонические способы изучения орфографии / Е. А.Лисовская. – Минск : Бел. ассоц. «Конкурс», 2007

5. Рапацевич, Е. С. Педагогика. Современная энциклопедия / Е.С. Рапацевич; под общ. ред. А. П.Астахова. – Минск : Современная школа, 2010. – 720 с.

6. Саламевіч, А. Мнемоніка пры вывучэнні беларускай мовы // Роднае слова. – 2011. № 2. – С. 77 – 79, № 4 – С. 75 – 77.

7. Щукин, А. Н. Лингводидактический энциклопедический словарь: более 2000 единиц / А. Н. Щукин. – Москва : Астрель: АСТ: Хранитель, 2008. – 746 с.

ЗАЯВКА
ДЛЯ УЧАСТИЯ В КОНФЕРЕНЦИИ

Прошу включить меня в программу региональную научно-практическую конференции «**Тенденции развития современного образования: наука и практика»**.

Фамилия Лопушко
Имя Татьяна
Отчество Ивановна
Место работы ГУО «СШ№18 г. Пинска»
Должность учитель белорусского языка и литературы высшей квалификационной категории
Название докладаИгровая деятельность детей: игровые технологии обучения («Выкарыстаннемнематэхнічныхпрыёмаў на ўрокахбеларускай-мовы»)
Адрес для контактов г. Пинск, ул. Минеева, 9-34
Тел. контактный (29) 927 40 10
E-mailvaly0505@tut.by